**Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь народны хор дзяржаўнай установы культуры «Тураўскі гарадскі дом культуры»**

Тураўскі народны хор створаны ў 1945 годзе. Першым кіраўніком і стваральнікам быў музыкант-аматар Сцяпан Радыёнаў.

У пачатку свайго заснавання хор быў не шматлікім. З прыходам да кіраўніцтва калектывам Мікалая Бяспалава Тураўскі хор узрос у прафесійным і колькасным узроўні. Удзельнікаў хору сталі запрашаць на абласныя і рэспубліканскія конкурсы. Выступалі ў Маскве ў Калонным зале Дома Саюзаў на Дэкадзе беларускага мастацтва.

Наступным кіраўніком хора быў Сяргей Рыгоравіч Белка – чалавек, які аддаў калектыву частку свайго прафесійнага жыцця. Пад яго кіраўніцтвам Тураўскі хор прымае ўдзел у канцэртнай праграме на Выставе дасягненняў народнай гаспадаркі (ВДНГ) СССР г. Масква.

З 1996 года Тураўскім народным хорам кіруе таленавіты музыкант, аранжыроўшчык, прафесіянал сваёй справы – Васіль Адамавіч Птушко. Ён складае музыку, піша да яе тэксты, робіць апрацоўкі народных песень.

У цяперашні час Тураўскі хор з’яўляецца пяцігалосным хорам, у лікавы склад уваходзіць 29 удзельнікаў самых розных прафесій.

Тураўскі хор вылучаецца высокім мастацкім і выканаўчым майстэрствам, асабістым выкананнем народнай песні на тураўскім каларыце, чым і адрозніваецца ад іншых калектываў.

У мэтах зберажэння і развіцця нацыянальнай культуры і спеўнага багацця сваіх бацькоў у рэпертуары хору значнае месца займаюць беларускія народныя песні, апрацоўкі фальклорнага матэрыялу сваёй мясцовасці.

Вялікай любоўю ў гледачоў карыстаюцца напісаныя кіраўніком хора песні – «Край ты мой на Палессі», «Песня аб роднай зямлі», «Ода Тураву».

Доўгія гады салістамі калектыву з’яўляюцца: Наталля Волкава, Наталля Сергіенка, Любоў Радыёнава, Валянціна Леўкавец, Канстанцін Кашэвіч, Таццяна Папок.

За гады работы калектывам былі дадзены шматлікія канцэрты, выступы на сцэнах малых вёсак і вялікіх гарадоў, а таксама за межамі Рэспублікі Беларусь – у Германіі, Расіі, Грузіі, Украіне і ў іншых краінах. Хор – актыўны ўдзельнік аглядаў-конкурсаў. За дасягнутыя поспехі ў працы калектыў быў узнагароджаны:

Званне «народны» калектыву было прысуджана ў 1962 годзе.

За ўклад і развіццё нацыянальнай культуры ў 2005 годзе хору было прысуджана ганаровае званне «Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь».

